ворыва, сяўбы, а ў гэтай нізіне ўсё яшчэ збіралася вада з далёкіх аколіц, асабліва з поўначы. У такі час і трапілі сюды гэтыя два хлопцы» [3, с. 7].

Падзеі ў творы падаюцца ў асноўным у храналагічнай паслядоўнасці. Той адрэзак часу (месяц), які дзеці правялі на востраве, апісаны даволі падрабязна, яго можна прасачыць дзень за днём, нават па раздзелах, якія ў большасці сваёй апісваюць падзеі аднаго дня. Таму час ад часу такая хранікальна-біяграфічная кампазіцыя нагадвае па сваёй структуры дзённікавыя запісы. Напрыклад, у сёмым раздзеле: «На другі дзень надвор’е выдалася зусім добрае. Вясна шпарка ішла наперад. Раніцою пайшлі падбіраць згубленыя ўчора арэхі...» [3, с. 45]. Заканчваецца раздзел такімі словамі пра герояў: «Як кожны вечар, пасля дзённых турбот гутарка іх перайшла да хатніх спраў...» [3, с. 48].

Што да кампазіцыі, то яе характарызуе своеасаблівы «паралелізм» сюжэта, асабліва выяўны ў раздзеле, дзе апісваюцца непасрэдна не звязаныя дзеянні кантрабандыстаў і хлопцаў, і аўтарскія адступленні для перадачы псіхалагічнага стану герояў, іх знешняга выгляду, думак: «Пачуццё адзіноты ахапіла хлопцаў. Чаго яны сюды забраліся, далёка ад людзей, ад сваіх блізкіх? Што ім тут рабіць? А калі і як выберуцца — яшчэ невядома. Нездарма з іх смяяліся таварышы, калі пачулі аб іх намеры. Такія думкі ўпарта лезлі ў галаву і Віктару і Мірону, але гонар не дазваляў прызнацца ў гэтым не толькі перад таварышам, але і перад самім сабою...» [3, с. 26]. У такія моманты пісьменнік нібы замаруджвае бег часу або ўвогуле «выключае» сюжэтны час.

Адлюстраванне гістарычнай рэальнасці ў аповесці патрабуе і рэалістычнай перадачы адзнак часу, у якім жывуць і дзейнічаюць героі, і пісьменнік робіць гэта як непасрэдна, заяўляючы ў зносцы, што «падзеі адбываюцца ў канцы 20-х гадоў» [3, с. 130], так і пры дапамозе ўскосных дэталяў. Гэта і ўпамінанне пра вучобу дзяцей у сямігодцы, што характэрна для таго перыяду, і іх актыўны ўдзел у краязнаўчым гуртку (на той час краязнаўчая дзейнасць дасягнула даволі значных маштабаў). Пісьменнік выкарыстоўвае характэрныя для адлюстраванага часу тапонімы і інш.

Для аповесці характэрна асэнсаванне героямі часу ў перспектыве, хай сабе і не вельмі значнай аб’ектыўна. Калі яны злавілі цецерукоў і вырашалі, якое сховішча для іх будаваць, то на прапанову Мірона зрабіць невялікі хлеўчык Віктар адказаў: «Нават і не надта маленькі, бо, можа, і яшчэ завядзецца якая жывёліна, напрыклад, дзікае парася, заяц, медзведзяня» [3, с. 64] .

На прыналежнасць твора да эстэтыкі сацыялістычнага рэалізму ўказваюць паводзіны хлопцаў ў час вяртання кантрабандыстаў на востраў разам з палонным, іх рашэнне не толькі дапамагчы палоннаму, але і ўдзел у арыштце злачынцаў, гераічныя паводзіны без кроплі сумнення, адказ на падзяку з боку Андрэя Саўчука: «Завошта? — шчыра здзівіўся Віктар. — Хто ж гэтага не зрабіў бы на нашым месцы?!» [3, с. 140].

Такім чынам, на прыкладзе аповесці Янкі Маўра «Палескія рабінзоны» ў той ці іншай ступені можна прасачыць, як літаратура аперыруе вобразамі часу біяграфічнага (дзяцінства, юнацтва, сталасць, старасць), гістарычнага (змена эпох і пакаленняў, значныя падзеі ў жыцці грамадства), касмічнага (уяўленні аб вечнасці і сусветнай гісторыі), каляндарнага (змена пор года, святаў і будняў), сутачнага (дзень і ноч, раніца і вечар), а таксама ўяўленнямі аб руху і нерухомасці, аб суаднесенасці мінулага, цяперашняга і будучага. Прычым гэта аперыраванне даволі свабоднае ў сэнсе пераходу з аднаго часу (альбо яго разнавіднасці) у іншы.

**Спіс крыніц**

1. *Тураев, С. В.* Справочные материалы: книга для учащихся / С. В. Тураев, Л. И. Тимофеев [и др.] — М. : Просвещение, 1989. — 335 с.
2. Мастацкі час і мастацкая прастора // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. — Мн. : БСЭ. — 1986. — Т. 3. — С. 678.
3. *Маўр, Я.* Палескія рабінзоны: аповесць: для сярэд. і ст. шк. узросту / Я. Маўр. — Мн. : Юнацтва, 1993. — 432 с.

Материал поступил в редакцию 03.11.2011 г.

***С. І. Гарбацік***
*Навуковы кіраўнік* — А. І. Белая,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ВОБРАЗ ВЫГНАННІКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ

Тэма выгнанніцтва праходзіць праз многія творы беларускай прозы XX стагоддзя. Гэта ў першую чаргу абумоўлена асаблівасцямі гістарычнага часу, эпохай «траістай вайны». Першым выпрабаваннем сталі для беларусаў падзеі Першай сусветнай вайны, якая абрынула нашых суайчыннікаў у вялікую бяздомнасць, вымусіла іх з сем’ямі і сціплым набыткам выпраўляцца ў глыб Расіі. Ваенная машына Расійскай імперыі ажыццяўляла на тэрыторыі Беларусі палітыку «выпаленай зямлі» ў самым жахлівым сэнсе гэтага слова. Гарэлі вёскі і мястэчкі, хаты і гумны, палеткі спелага жыта.

У рамане Ц. Гартнага «Сокі цаліны» трагедыя бежанства найбольш яскрава перадаецца праз вобраз Сёмкі Хведарава Загона. Калісьці добры гаспадар, старанны і прагны да працы на зямлі, ён робіцца адным са спакутаваных

Репозиторий БарГУ

і адарваных ад родных мясцін выгнаннікаў. Ніколі і не думаў ён, што прымерае на сябе такі лёс. Аднак у рамане прасочваецца адзін амаль незаўважны эпізод, які адыгрывае ролю яскравай мастацкай дэталі. У далейшым робіцца відавочнай прарочая роля гэтага эпізода. Праводзячы Рыгора Нязвычнага, Сёмка на станцыі заўважае, як «…прайшла купаю сям'я — мужчына-гаспадар у палапленай крамнай жакетцы, у аблезлай шапцы, з дзіцём на руках і кабета-жонка, таксама бедна адзетая, з клункам старых манаткаў і з двума невялічкімі дзеткамі. Увайшлі, баязліва азірнуліся, як бы папаўшы не туды, куды б следавала ім, і бяспомачна спыніліся каля дзвярэй. Куды яны едуць? Чаму з дзецьмі?» [1, с. 207]. Пра гэтых людзей ён забываецца ўжо праз імгненне, але неўзабаве і сам з бацькамі, жонкаю і дзецьмі, пасадзіўшы на воз суседку Стэфу Нязвычную, сам рушыць у невядомасць.

Жах і трагізм лёсу героя перадаецца праз апісанне яго знешняга выгляду. Рыгор з цяжкасцю «пазнаў у змардаваным, пахудзелым, ссутуленым, не па гадам пастарэўшым селяніне — Сёмку» [2, с. 353] Яшчэ зусім нядаўна вясёлы спрытны хлопец, які, здаецца, мог знайсці выйсце з усякай сітуацыі, не баяўся рызыкаваць, выглядае амаль бездапаможным, спакутаваным чалавекам. Пакутай дыхаюць не толькі абліччы людзей, а і рэчы. Усё, што было прыдбана цяжкой працай, выглядае мізэрным. «Страшным жахам нясло ад змучанай сям'і, з'езджанага каня, з высахшых і збітых калёс, з слабенькіх драбінак, напакаваных рэшткамі доўгагадовага набытку» [2, с. 355].

У нялёгкай выгнанніцкай дарозе Сёмка страчвае бацьку. Але вайна не толькі адбірае самае дарагое, а і робіць чэрствымі душы людзей. Волька, якая заўсёды была спагадлівай да чужой бяды, цяпер выйсце бачыць у смерці: «Вось яны памерлі — то спакайнейшымі будуць. Ці не лепш, падумай, чым валачыцца па свеце?» [2, с. 354]

Пакуты, страта бацькі, жонкі падкошваюць Сёмку. Ён прызнаецца сябрам: «Даняло, браткі!.. Ведаеце — жалезным будзь, а паддасіся…Гэткі цяжкі шлях! Змагаўся, колькі было сілы... Нарэшце стаў паддавацца» [2, с. 458] Відаць, больш сілы змагацца не засталося. Маральна-духоўны тупік героя адбіўся ў фінале твора: «На Сярэднім праспекце зарэзаны трамваем чалавек… Па дакументах — Сёмка Хведараў Загон» [2, с. 479]. Кожны з герояў рамана знайшоў сваё выйсце з пакут. На жаль, некаторыя знайшлі збавенне толькі праз смерць.

У вялікай бяздомнасці апынуліся і героі рамана В. Карамазава «Бежанцы». Цяжкі лёс выпадае на долю сям'і Захара Падабеда. 1941 год гоніць яго з блізкімі людзьмі далёка ад родных мясцін, а праз некалькі дзесяцігоддзяў Чарнобыль ператварае ў бежанцаў яго сына і ўнука.

Трагедыя бежанства падаецца ў рамане праз успаміны галоўнага героя, чым рэалізуецца двухпланавасць кампазіцыі. Нібы праводзіцца паралель паміж сённяшнім і мінулым героя. Тады гнала вайна, а цяпер — нябачная смерць, якую цяжка ўсвядоміць. І невядома, што страшней.

Людзі пачалі з'язджаць не адразу пасля абвяшчэння вайны. Кожны быццам чакаў нечага, не верылі, ды і не хацелі верыць, што з імі можа гэтакае стацца. «…Жыў-быў чалавек, абрастаў хатамі, хлявамі, жывёлаю, птушкаю, рэчамі, звычаямі, знаходзіў, не заўсёды хай разумна і лёгка, сваё месца паміж людзьмі, і вось на табе — кідай усё, што ў хаце ды хлявах, як чужое, непатрэбшчыну» [3, с. 31-32].

Жахлівая карціна паўстае перад вачамі: людзі, дзеці, коні з вазамі… І ўвесь гэты натоўп рушыць туды, дзе, здаецца, можна будзе схавацца ад чорнай навалы. І ўжо нікога нельга спыніць, напалохаць: «Людскую раку, якая плыла наперад, ужо ні агонь, ні размовы пра дыверсантаў стрымаць не маглі, па бруку цокалі конскія капыты, бразкацелі вёдры — галасы і гукі прыспешвалі натоўп» [3, с. 38].

У кожнага, хто пакідае родны куток, павінны быць заступнікі. І тут сімвалічным з'яўляецца вобраз бабы Марфы. Яна не ідзе разам з усімі, а застаецца, блаславіўшы ўсіх на гэты нялёгкі шлях. І доўга яшчэ азіраўся Захар на адзінокую постаць: «… Вышэй узнімалася на гары ціхая заступніца за кожную жывую душу цётка Марфа» [3, с. 41].

У рамане В. Карамазава «Бежанцы» ёсць яшчэ адзін значны сімвалічны вобраз — вобраз дарогі. Дарога як надзея, як выратаванне. Дарога як жыццё. Яна яшчэ з дзяцінства, калі Захар разам з дзедам Грынькам хадзіў зарабляць, стала яму дарагой: «Шмат дарог прайшоў Захар Падабед за сваё жыццё. З усіх, што выпалі на яго долю, у памяць наймацней урэзаліся лясныя дарогі» [3, с. 111]. І цяпер, уцякаючы ад вайны, ён падумаў, што «…пайшоў у гэта бежанства, не адчуваючы ў нагах і за плячыма цяжару, таму, што раней, усё жыццё, не адчуваў цяжару дарог, бо на дарогах вырас» [3, с. 133]. Менавіта дарогі навучылі Захара многаму: «…слухаць і бачыць чужое, разумець чужое галавою і сэрцам як сваё…» [3, с. 114]. Бежанства ў жыцці Захара Падабеда можна разглядаць як наканаванне, ад якога нельга ні ўцячы, ні схавацца. Мабыць, лёсам было яму наканавана гэтым шляхам прайсці праз усё жыццё. Нават сам ён адчуў: «…што бежанцам зрабіўся не цяпер, а яшчэ тады, побач з Грынькам» [3, с. 114]. Тым не менш, нягледзячы на ўсе перыпетыі лёсу, героі рамана вераць у лепшае і змагаюцца за яго.

Вобразы Сёмкі Загона і Захара Падабеда, створаныя ў розныя гісторыка-культурныя перыяды, маюць тыпалагічнае падабенства. Вайна гоніць іх ад родных палеткаў, у абодвух на руках малыя дзеці, абодва рушаць у невядомую будучыню, адчуваючы непарыўную балючую повязь з малой радзімай.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс крыніц**


1. *Гартны, Ц.* Сокі цаліны: раман у чатырох квадрах / Ц. Гартны. — Т. 1. — Мн. : «Юнацтва», 1993. — 444 с.
2. *Гартны, Ц.* Сокі цаліны: раман у чатырох квадрах / Ц. Гартны. — Т. 2. — Мн. : «Юнацтва», 1993. — 493 с.
3. *Карамазаў, В.* Бежанцы: раман / В. Карамазаў. — Мн. : «Мастацкая літаратура», 1993. — 287 с.


Материал поступил в редакцию 03.11.2011 г.